Семечка К.М., студ. гр. 113 д ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Рынкевіч І.У.,
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# ТВОРЧЫ МЕТАД А.У. БАЦВІНЁНКА

«Калі мы страцім нацыянальную своеасаблівасць – для свету мы будзем уяўляць толькі масу, а пакуль мы з’яўляемся тым, што складае частку сусветнай культуры». Гэтыя словы скульптара Аляксандра Бацвінёнка з’яўляюцца яго крэда, якое адлюстроўваецца ў творчасці мастака, што робіць яго работы актуальнымі на сённешні дзень. Спадзяемся, што знаёмства з Аляксандрам Бацвінёнкам дапаможа глыбей зразумець стан сучаснага развіцця беларускага мастацтва.

Прапанаваны артыкул – спроба сабраць у адзінае цэлае звесткі аб творчасці скульптара, асвятліць некаторыя пытанні, звязаныя з яго творчасцю, пазнаёміцца бліжэй з яго працамі, індывідуальнай творчай манерай.

Аляксандр Уладзіміравіч Бацвіненак з'яўляецца аўтарам шматлікіх скульптур, выкананых з самых розных матэрыялаў — дрэва, бронзы, мармуру. Вельмі разнастайная тэматыка твораў Аляксандра Бацвінёнка, і кожная яго скульптура індывідуальная. Мастак скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве, Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, творчая майстэрня Акадэміі мастацтваў СССР у Мінску. Вучыўся у такіх вядомых скульптараў, як А.Анікейчык, Г.Мурамцаў, А.Арцімовіч, З.Азгур [ 6., с. 58 ]/

Для А.Бацвінёнка, пастаянныя міфалагічныя і партрэтныя жанры. У залежнасці ад задумы выбірае і выяўленчыя сродкі. Да кожнага твора мастак старанна рыхтуецца, вывучае матэрыял, і толькі пасля пачынае працу. Скульптуры Бацвінёнека прыцягальныя, у іх адчуваецца добрая падрыхтоўка і прафесійная школа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адна з яго знаходак – эксклюзіўная тэхналогія: спалучэнне саломкі і дрэва. Для гледача «Анёл», «Хлопчык з рыбакамі», «Партрэт жонкі», «Архангел Міхаіл» - яркае славянскае прачытанне тэмы, якое падкрэслена арганічным спалучэннем матэрыялаў.

Падчас стажыроўкі ў акадэмічных майстэрнях пад уплывам Міхаіла Савіцкага зрабіў шэраг скульптур ваеннай тэматыкі. Арыгінальная кампазіцыя «Партызанскі хлеб», якая была куплена Нацыянальным мастацкім музеем і экспанавалася ў 1985 г. у Маскве на выстаўцы, прысвечанай 40-годдзю Перамогі, увайшла ў альбом «Маладыя мастакі СССР» і каталог «Беларускае мастацтва дваццатага стагоддзя» [ 5., с. 122 ].

Звяртаецца ён і да гітарычнай тэмы («Беларускія майстры XVII ст.», «Еўфрасіння Полацкая», «Анёл»). У рэльефе «Беларускія майстры XVII ст.» кампазіцыя задумвалася ў традыцыях каталіцкіх храмаў, таму на рэльефе чатыры планы: пастамент, постаці майстроў з гістарычнымі элементамі, святы ў цэнтры з матэрыяй і разны фон. Работа упрыгожана архітэктурным корабам з цыркульнымі аркамі (тым самым падкрэсліваецца, што ён праваслаўны). У гэтым рэльефе выкарыстаны прыёмы каталіцызму і праваслаўя, адлюстраваны асноўныя канфесіі Беларусі. На алтарах – прысвячэнне: «не пагарджаць святым сваім мінулым» (У. Караткевіч), якое нагадвае нам пра тое, што ў нас ёсць гонару за сваіх майстроў і падставы для развіцця традыцый. У беларускіх цэрквах царскія вароты звычайна былі з саломкі, якая ў дадзеным выпадку замяняла золата. Той жа прыём скарыстаны ў скульптуры «Анёл». Саломка ўпрыгожвае і партрэт яго жонкі. Ёю інкруставаны валасы і ўбор, што надае гэтай рабоце незвычайнае свячэнне і цеплыню.

У Бацвінёнка некалькі станковых скульптур прысвечаны Ф.Дастаеўскаму, творчасцю якога мастак захапіўся з 1980-х гадоў. Ен прысвяціў вялікаму пісьменніку шэсць работ. Да вобраза пісьменніка скульптар звяртаецца ў розны час жыцця. Выявы Дастаеўскага выкананы з розных матэрыялаў: мармур, бронза, граніт.. Скульптуры пісьменніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заснаваны на дакументальных успамінах Грыгаровіча. Бацвінёнак прафесійна ярка вырашыў задачу, раскрыў партрэтнае падабенства, тыпізацыю, характар мысліцеля XIX ст. Тры скульптуры з гэтай серыі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі і ў музеі-кватэры Ф.Дастаеўскага ў Санкт-Пецярбургу.

Аповед пра творчае жыцце Бацвінёнка будзе няпоўным, калі не назваць яго манументальныя творы. Упрыгожвае г.Мсціслаў, помнік Пятру Мсціслаўцу, які створаны скульптарам ў 2001г. разам з А.Чыгрыным і архітэктарам Юрыем Казаковым. У вёсцы Трафімавічы Дзятлаўскага раёна Бацвінёнак зрабіў помнік загінуўшым жыхарам у гады вайны, стварыў мемарыяльныя дошкі Ф.Багушэвічу на будынке бібліятэкі ягонага імя ў Мінску, Чарняхоўскаму, Смалячкову. Ёсць праекты і ўжо зроблены макеты помнікаў Якубу Коласу, Міколу Гусоўскаму, Васілю Быкаву… Невычарпальныя для яго тэмы беларускіх асветнікаў: Кірылы Тураўскага і Еўфрасінні Полацкай, да якіх мастак шукае новыя вобразныя рашэнні [ 2, с. 30].

Скульптар пастаянна прымае ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных сімпозіумах. Усё пачалося з міжнароднага пленэру па камяні, які адбываўся ў Гродне, тады Бацвінёнак з даламіту зрабіў паркавую скульптуру. Затым ў Мінску прайшоў пленэр, на якім кампазіцыя А.Бацвінёнка «Зіма» атрымалася вялікай па памерах, хоць і рабіў яе скульптар уручную, не карыстаючыся тэхнікай. Зробленая на наступным пленэры ў Магілёве выява Еўфрасінні Полацкай, аздобленая смальтай доўгі час упрыгожвала ўваход ў Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Усе творы былі азначаны як лепшыя. Чарговы раз Бацвінёнка запрасілі ў Турцыю, калі ў горадзе Мула мясцовы ўніверсітэт праводзіў сімпозіўм па скульптуры. Бацвінёнак здзівіў прафесійнай, тонка выкананай постаці Венеры. Атрымалася адно з самых цікавых спалучэнняў матэрыялаў – у рабоце «Нараджэнне Венеры»: мармур і жэмчуг. Паводле падання Венера выйшла з пены марской, жэмчуг – пена, што ажыўляе хвалі, каштоўнасць, якая вынесла такую прыгажосць на свет Божы. Праз два гады

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бацвінёнак быў запрошаны на сімпозіўм у Турцыю і ў г. Маен (Германія). Мастак атрымаў заказ зрабіць з туфу і базальту скульптуру «Фенікс», што сімвалізуе Адраджэнне. Яе прысвяціў 20-годдзю чарнобыльскай катастрофы, бо паводле міфалогіі птушка Фенікс, згараючы, адраджаецца з попелу. Дый туф – гэта вулканічны попел, базальт – лава. Матэрыял як нельга лепш падкрэсліў тэматыку пластычнай кампазіцыі. На ўсіх сімпозіўмах Бацвінёнак дэманструе нязменна высокую якасць беларускага мастацтва. Пацвярджэннем высокага прафесіяналізму стаў той факт, што ўсе скульптуры, створаныя ім на форумах, устаноўлены ў гарадах [1, с. 4 ].

У выніку хацелася б адзначыць, што скульптуры А.У.Бацвінёнка – яркая і арыгінальная старонка беларускага мастацтва, выразны прыклад сінтэзу прафесіаналізму з непаўторным індывідуальным стылем скульптара.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Бялова М. // Літаратура і мастацтва. 1999, №47. – 48 с.
2. Купрыянава, І. Ад Дастаеўскага да вечнага. // Беларусь. – 2007 — №7. – 51 с.
3. Васілевіч, І. Жывыя постаці. // Беларуская думка. – 200 7– № 9. – 142 с.
4. Гісторыя беларускага мастацтва. – Мн. : Бел. навука, 1990. – Т. 4. – 290 с.
5. Сучасная беларуская скульптура. – Мн. : выдавецкі цэнтр БДУ, 2006. – 177 с.
6. Беларускі саюз мастакоў 1938-1998. – Мн. : Бел. навука, 2003. – 542 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ